


# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

Выдаецца з 1986 года • № 8 (259) • 2 лістапада 1998 года, панядзелак
Выходзіць адзін раз на месяц • Распаўсюджваецца бясплатна


## НА ПЛЫНІ СТУДЭНЦКАГА ЖЫЦЦЯ



**Факультэт эканомікі і кіравання - найбольш папулярны факультэт на сённяшні дзень. Пасля юрыдычнага, вядома. Многіх цікавіць спецыяльнасць «Эканамічная кібернетыка». Вось і Таня Трафімовіч выбрала сабе гэту спецыяльнасць. Яно і не дзіўна: вучылася ў матэматычным класе СШ N 25. Дома мае персанальны камп'ютар. З сур'ёзнасцю адносіцца да вучобы. Апошнія дзве сесіі здала на «выдатна». З'яўляецца старшынёй студэнцкага прафкама факультэта. Таццяна лічыць, што яе будучыня - у яе руках. Усё залежыць ад адносін да вучобы і жыцця.**

**На здымку : студэнтка 5 курса факультэта эканомікі і кіравання Таццяна ТРАФІМОВІЧ.**

**Фота Ул. САРОКІНА.**

## АБМЕРКАВАНА РЭКТАРАТАМ

[illegible]стрычніка на пася[illegible]ні рэктарата былі аб[illegible]ркаваны надзённыя пытанні універсітэцкага жыцця. У прыватнасці, члены рэктарата абмяркоўвалі пытанне аб графіках прадстаўлення дакументацыі факультэтаў і кафедр у навучальную частку; прапановы па выкананні інструктыўна-метадычнага пісьма Міністэрства адукацыі РБ аб вывучэнні спецыяльных курсаў «Правы чалавека», «Правы дзіцяці» у вну; аб графіках работы вучэбна-дапаможнага персаналу.

Была заслухана інфармацыя намесніка загадчыка планавага аддзела А.І.Мустафаевай па падрыхтоўцы каштарысу расходаў, загадчыка сектара платнай адукацыі Ю.Р. Бейцюка аб стане аплаты за навучанне.

Абмеркавалі члены рэкта[illegible] і палажэнне аб с[illegible]адбавак да заработнай платы.

* * *

На пасяджэнні рэктарата 19 кастрычніка была заслухана інфармацыя начальніка аддзела па выхаваўчай рабоце Г.М. Кабяка «Аб выніках работы камісіі па праверцы выканання адміністрацыйна-гаспадарчых работ па падрыхтоўцы да навучальнага года». Камісія выявіла шмат недахопаў і парушэнняў у гэтай справе. Было заслухана таксама паведамленне інжынера па тэхніцы бяспекі і ахове працы М.К. Левандоўскага аб стане аховы працы ва універсітэце.

## НИРС-98

7-8 октября на базе нашего университета проводилась IV Республиканская научная конференция студентов и аспирантов, в работе которой приняли участие свыше 600 представителей вузов Республики Беларусь.

Торжественное открытие конференции состоялось в актовом зале филологического факультета по улице Ленина. С приветственным словом к участникам конференции обратились ректор Гродненского государственного университета имени Янки Купалы профессор С.А. Маскевич, заместитель министра образования Республики Беларусь О.Г. Слука, исполнительный директор БКЦ НИРС В.И. Микулович.

В первый день состоялось пленарное заседание, затем началась работа двадцати четырех секций по самым разным направлениям науки.

В период проведения конференции ее участники познакомились с работой факультетов и кафедр Гродненского государственного университета имени Янки Купалы. В заключение конференции для ее участников был дан концерт художественной самодеятельности студентов, организована экскурсия по городу.

## ВІНШАВАЛЬНАЯ ПАШТОЎКА

***НАГАДВАЕМ, КАЛІ І КАГО МОЖНА ПАВІНШАВАЦЬ З ЮБІЛЕЕМ.***

* 1 лістапада - **Чаславу Іосіфаўну РАЎДЗЮК** - дзяжурную інтэрната N 3.

* 13 лістапада - **Алену Анатольеўну ЯЎСЕЕВУ** - дацэнта кафедры інжынерна-тэхнічнай падрыхтоўкі.

* 24 лістапада - **Анну Іванаўну НАВІЦКУЮ** - сакратара навучальнага аддзела.

* 27 лістапада - **Ніну Сяргееўну КОНАНАВУ** - дацэнта кафедры рускай мовы.

* 30 лістапада - **Ядзвігу Баляславаўну САДАЎНІЧУЮ** - прыбіральшчыцу навучальнага корпуса N 1.

## Віншуем!

**Ніну Сяргееўну КОНАНАВУ** з юбілеем. Жадаем моцнага здароўя, шчасця, даўгалецця.

**Савет ветэранаў.**

## ЦИТАТА НОМЕРА:

***«Счастье достается тому, кто много трудится».***

***Леонардо да Винчи.***

# ГРОДЗЕНСКАМУ ДЗЯРЖАЎНАМУ УНІВЕРСІТЭТУ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ - 60 ГАДОЎ

*Постаці ВНУ*

## АДНА З ПЕРШЫХ

Віктар ТАРАНЦЕЙ, прафесар

Сярод вучняў Клаўдзіі Аляксееўны Акімавай - прафесар, доктар фізіка-матэматычных навук Г.П. Яблонскі, старшы навуковы супрацоўнік, кандыдат фізіка-матэматычных навук Ю. Курачкін, прафесар С.С. Ануфрык, дацэнт А.У. Мілінкевіч і іншыя вядомыя вучоныя. За



гады працы з 1944 па 1970 год яна займалася выкладчыцкай і навуковай працай на розных пасадах: старшага выкладчыка, загадчыка кафедры, дэкана фізіка-матэматычнага факультэта.

Не было ў К.А. Акімавай тытулаваных і іншых званняў, не вельмі ахвотна прысвойвалі іх у той час. У архіве захаваліся матэрыялы, якія сведчаць аб тым, з якімі вялікімі цяжкасцямі К.А. Акімава ў нашай былой сталіцы Маскве замацоўвалася для здачы экзаменаў кандыдацкага мінімуму.

Відавочна, у К.А. Акімавай, як і ва ўсіх жыхароў даваеннай Расіі і Беларусі, жыццё было няпростым. Цяжкая праца з 13 гадоў на тэкстыльнай фабрыцы загартавала волю і характар, умацавала фізічна. Навыкі зносін з людзьмі і арганізацыйныя якасці выпрацавала работа. Кім толькі ні працавала Клаўдзія Аляксееўна -сакратаром камітэта і райкама камсамола, выкладчыкам фізікі школы, намеснікам дырэктара і выкладчыкам фізікі і матэматыкі Мсціслаўскага педагагічнага вучылішча. Па тых часах яна атрымала першаякасную адукацыю, закончыўшы фізіка-матэматычны факультэт Беларускага дзяржуніверсітэта імя У.І. Леніна (1939 г.)

Здавалася б, дастаткова было на шляху К.А. Акімавай нягод. Але найбольш цяжка было перажыць у 1937 годзе расстрэл у сталінскіх засценках мужа.

Пазней, у 1953 годзе, К.А. Акімава ў Гродне стварыла новую сям'ю з інтэлігентам вышэйшай пробы - дацэнтам Н.Д. Беспамятных. Абодва гэтыя навукоўцы ўнеслі важкі ўклад у развіццё навукі на фізіка-матэматычным факультэце і ў цэлым у рэгіёне.

Адной з першых К.А. Акімава прыехала пасля вызвалення Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў у Гродна, каб стварыць тут на базе настаўніцкага інстытута педагагічны інстытут. Першыя заняткі са студэнтамі яна пачала 10 кастрычніка ў 321 аўдыторыі галоўнага корпуса універсітэта. Успаміны К.А. Акімавай сведчаць «Па прапанове ЦК КПБ і накіраванні Міністэрства адукацыі Беларусі прыехала на работу ў Гродзенскі педагагічны інстытут. Да гэтага часу быў аб'яўлены прыём студэнтаў на факультэты: фізіка-матэматычны, філалагічны і замежных моў. Аўдыторыі былога настаўніцкага інстытута (гімназіі) былі ў запусценні, пустаце, вокны выбіты, бібліятэка разрабавана і знішчана. У аўдыторыях трэцяга паверху сцены былі заліты крывёю. На фізіка-матэматычным факультэце захаваўся толькі адзін падручнік Прывалава па аналітычнай геаметрыі. Пры рабоце з падручнікамі быў такі парадак: падручнік выдаваўся студэнту на дзве гадзіны. Затым ён перадаваўся іншаму студэнту. За працэсам руху падручнікаў строга сачыла загадчык бібліятэкі С.А. Памеранц. Кнігамі дапамагалі маскоўскія і ленінградскія бібліятэкі, грамадзяне горада. Ацяпленне было пячным, самі выкладчыкі і студэнты нарыхтоўвалі сумесна дровы. Жылі ўсе разам там жа, у вучэбным корпусе.

Да кастрычніка 1944 года на фізмат былі залічаны 27 студэнтаў. З іх - 3 беларусы, 3 палякі, 1 рускі (П.А. Наўмюк), 4 яўрэі, з іх адна партызанка (Ліза Чапнік), Стралецкія (муж і жонка), якія пражылі ўсю вайну ў склепе ў адным беларускім сяленні. Шэсць чалавек паступілі з адпаведнай падрыхтоўкай (закончылі настаўніцкі інстытут) на трэці курс філфака, і 7 чалавек навучаліся на факультэце замежных моў.

Рэктарам вну быў Н.В. Власавец, гісторык. Да работы прыступілі матэматык Я.І. Рыўкінд, мовазнаўца І.Л. Рэй, былы настаўнік гімназіі выкладчыца французскай мовы Немчыновіч і іншыя.

Гродна ў той час быў прыфрантавым горадам. У будынку гімназіі вокны былі забіты фанерай. Фашысцкія самалёты яшчэ рабілі налёты на Гродна. Спачатку студэнты палохаліся кулямётнай стральбы і барабаніўшых па даху куль, а потым прывыклі і не звярталі на гэта вялікай увагі. Артылерыйская кананада была чутна ў горадзе яшчэ доўгі час...»

Клаўдзія Аляксееўна была заўжды ветлівай, добразычлівай, гатовай дапамагчы ва ўсіх справах выкладчыкам і студэнтам. Старалася выхоўваць у студэнтаў высокія маральныя якасці, аказвала ім дапамогу, нават запрашала сваіх вучняў за сямейны стол, разумеючы, як студэнту цяжка было пракарміцца ў той час. З ёю можна было параіцца кожнаму, як са старэйшай сястрой.

З невялікімі перапынкамі яна аддала нашай вну амаль чатыры дзесяцігоддзі плённай самаадданай працы. Набыткі сям'і Акімавай-Беспамятных дастойна развівае іх сын - дацэнт нашай вну М.Н. Беспамятных.

К.А. Акімава была жанчынай невялічкага росту, але, як многія з яе калег, прыняла на свае плечы цяжар стварэння новай вну ў Заходняй Беларусі. Менавіта такім жанчынам маленькага расточку прысвяціў шатландскі паэт Р. Бернс свае словы: «На то и меньше мой алмаз гранитной темной глыбы, чтобы дороже во сто раз его ценить могли бы...»

Ганаруся, што быў у ліку яе вучняў.

## ЗАНИМАЕМСЯ И МАРКЕТИНГОМ

В нашем университете вышла в свет книга «Основы маркетинга: теория сбыта» - пособие по одноименному курсу для студентов экономических специальностей. Составитель - старший преподаватель кафедры межд[illegible]родных экономических отношений А.Л. Белоусов ставил перед собой цель - изложить основы современного маркетинга: сбыт и маркетинг, исследование рынка, производственная политика, коммуникативная, дистрибутивная политика предприятия. Эту задачу составителю удалось выполнить. Кстати, работники издательского отдела восприняли маркетинг как концепцию предпринимательства и предложили это издание другим учебным заведениям республики. «Основы маркетинга...» приобрели у нас для учебных целей Могилевский госуниверситет имени А.А. Кулешова, Могилевский технологический институт, Гродненский сельхозинститут, ряд областных [illegible]учных библиотек, с[illegible]их специальных учебных заведений.

Университет расширяет свои деловые связи в области издательской деятельности. Сегодня практически в каждой области Беларуси есть заказчики на издаваемую нами учебную литературу. А выпускаем мы ежегодно более ста наименований учебной, научной, научно-популярной и справочной литературы. Только в этом году реализовано литературы почти на 350 миллионов рублей.

**Г. ДАНИЛОВ,**
**редактор издательского отдела.**

## ПРАФСАЮЗНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

14 кастрычніка адбылася агульнауніверсітэцкая студэнцкая прафсаюзная канферэнцыя, на якой са справаздачай аб рабоце студэнцкага прафкама за 1996-1998 гады выступіў старшыня прафкама студэнтаў А. Грынь. З інфармацыяй аб расходаванні грашовых сродкаў прафкама за справаздачны перыяд выступіў І. Кергет.

Была заслухана інфармацыя старшыні студэнцкага прафкама А. Грыня «Аб ходзе выканання пагаднення паміж адміністрацыяй Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы і прафкамам студэнтаў 1997-1998 года», а затым быў абмеркаваны праект такога ж пагаднення на 1998-2001 гады.

Абмеркаваны таксама пытанні арганізацыйнага характару, пытанні з раздзелу «рознае».



**Часам можна пачуць, што выпускнікі сельскіх школ не так ужо і часта вытрымліваюць конкурс. Аня Дарашкевіч - прыклад таго, што і ў сельскай школе можна атрымаць трывалыя веды. Варта толькі захацець. Яна - з Ваўкавыскага раёна. Паступіла з першай спробы, пасля першага курса вучыцца толькі на «выдатна». З'яўляецца прафоргам факультэта, старастам групы, захапляецца работай у гісторыка-краязнаўчым гуртку.**

**На здымку: студэнтка 4 курса, праforг факультэта гісторыі і культуры Ганна ДАРАШКЕВІЧ.**

**Фота Ул. САРОКІНА.**

# С ЗАБОТОЙ О ВАС И ДЛЯ ВАС

**Основные направления деятельности профсоюзного комитета студентов Гродненского государственного университета имени Янки Купалы за 1997-98 учебный год**

***По материалам доклада председателя профкома студентов А.А. ГРИНЯ***

Профком студентов регулярно проводил прием студентов по интересующим их вопросам. Давались обоснованные нормативными документами ответы и консультации. Для развития и активизации здорового образа жизни профкомом поддерживались спортивные мероприятия: соревнования по различным видам спорта (баскетболу, плаванию, легкой атлетике и др.), спартакиада, День здоровья, спортивный вечер, а также распространялись по льготной цене абонементы в ФОК.

Регулярно рассматривались заявления на материальную помощь и осуществлялись ее выплаты. Также материально поощрялись студенты, активно участвовавшие в научной, общественной, культурной, спортивной жизни факультетов и университета.

Кроме того за активное участие в профсоюзной работе и за высокие достижения в учебе студенты получали профсоюзные стипендии в течение семестра: обкома профсоюза - Ю. Сегиневич, А. Борисовский; Белорусской Федерации профсоюзов - А. Крищик.

Проводилось обучение профактива, в том числе с участием председателя обкома профсоюза А.А. Подгайченко. Председатель профкома студентов принимал участие в республиканских семинарах руководителей профсоюзных организаций высших учебных заведений.

С участием профкома студентов проводилось большое количество развлекательных и воспитательных мероприятий с целью организации отдыха и досуга студентов.

Это - посвящение в студенты; организация конкурса первокурсников «Alma mater - любовь с первого взгляда» с финалом, приуроченного ко Дню Студента; мероприятие, посвященное Дню молодежи; вечер, посвященный Дню профилактики СПИДа; новогодний вечер; новогодний утренник для детей студентов; мероприятия, посвященные Татьяниному дню; Дню Св. Валентина; вечер, посвященный Дню Защитника Отечества, а также Международному женскому дню 8 марта; конкурс команд КВН и финал в День юмора 1 апреля; областной и республиканский туры фестиваля «Студенческая весна-98»; вечер, посвященный Дню Победы в Великой Отечественной войне; концерт оркестра под управлением М.Финберга; поддерживались и проводились культурные мероприятия на факультетах.

Для таких мероприятий выделялись финансовые средства, проводилась организационная работа совместно с отделом по воспитательной работе, факультетом общественных профессий, студклубом, спортклубом, СТЭМ «Вернисаж», агитбригадами факультетов, отделом по работе с молодежью горисполкома.

Создана сборная команда КВН «Янкі», которая участвовала в двух республиканских фестивалях команд КВН, вышла в первую лигу белорусского КВН.

Для активизации научно-исследовательской работы студентов совместно с администрацией университета проводилась научная студенческая конференция «Наука-98».

Проводилось активное взаимовыгодное сотрудничество с другими организациями: администрацией университета (в первую очередь, с отделом по воспитательной работе и студклубом); профкомом сотрудников и преподавателей; с вышестоящими организациями: обкомом профсоюза, БРК профсоюза (участие в Республиканских семинарах председателей студенческих профкомов, один из которых проходил на базе Гродненского государственного университета имени Янки Купалы; с профкомами студентов Гродненского мединститута, Белорусского государственного университета -отделом по воспитательной работе БГУ; отделом по работе с молодежью горисполкома, Комитетом по делам молодежи облисполкома; - студсоветом МГУ и Евразийской студенческой Ассоциацией, членом которой является и наш профком, а также с Республиканской Ассоциацией международных обменов и туризма, Международной Ассоциацией студентов, изучающих экономику AIESEC.

Представители профкома участвовали в официальных мероприятиях (возложение цветов, торжественных заседаниях и др.), посвященных Государственным праздникам и памятным датам.

Представители профкома участвовали в работе III Конгресса Евразийской студенческой ассоциации, участвовали в семинарах, проводившихся РАММОТ и Государственным комитетом по делам молодежи по международному студенческому билету ISIC. Профком в ряде мероприятий сотрудничал с БПСМ и БСМ.

Закупали новогодние подарки для детей студентов и совместно с профкомом сотрудников провели новогодний утренник. Представители профкома принимали участие в работе ректората, Совета университета, Советов факультетов и университетских комиссий, деятельность которых затрагивает интересы студентов, участвовали в разработке соответствующих нормативных документов.

Распространялись льготные абонементы в облдрамтеатр (400 штук), льготные билеты в ФОК (80 штук), льготные билеты на различные мероприятия в городе.

Проводились экскурсии по историческим местам Республики Беларусь, организовывались студенческие сельскохозяйственные отряды для работы в Ставропольском крае и в Венгрии.

Было получено из городского центра оздоровления 15 путевок, благодаря которым смогли оздоровиться 22 студента.

# СЦЕЖКАМІ ПРОДКАЎ

**Р. КАЗЛОЎСКІ,**
**старшы выкладчык кафедры беларускай літаратуры, кіраўнік фальклорнай практыкі**

Беларускі фальклор - гэта бясцэнны скарб духу, - які перадаецца многімі сотнямі гадоў ад пакалення ў пакаленне. У ім захоўваюцца не толькі звесткі пра пэўныя святы, звычаі, працу, але і адлюстраваны асабістыя ўзаемадачыненні людзей, інтымныя пачуцці, душа народа. Адарвацца ад гэтага скарбу - згубіць яе, а страціць душу - перастаць быць чалавекам...

Фальклорная практыка на беларускім аддзяленні філалагічнага факультэта ГрДУ пасля шматгадовага ў свой час перапынку зноў праводзіцца ўжо другі год. У адпаведнасці з «Перспектыўнай праграмай вывучэння беларускага фальклору» у Гродзенскай вобласці, распрацаванай на кафедры беларускай літаратуры ў 1996 годзе адным з важнейшых кірункаў працы вызначаецца збор фальклорнага матэрыялу, у прыватнасці, шляхам правядзення фальклорных практык, якія, трэба зазначыць, з'яўляюцца і часткай навучальнага і выхаваўчага працэсу. Сёлета 6 групаў (па 12 чалавек) студэнтаў беларускага аддзялення выехалі ў розныя месцы Гродзеншчыны, якія былі ўзгоднены з Саюзам фальклarystaў Беларусі: в. Тарнова Лідскага раёна (кіраўнікі Р.К.Казлоўскі, С.М.Тарасава), в. Галубы Мастоўскага раёна (кіраўнікі І.І.Трацяк, Ю.А.Якубовіч), г.п. Іўе (кіраўнікі А.А.Раманчук, А.З.Астраух). У арганізацыі практыкі вялікую дапамогу аказалі супрацоўнікі Гродзенскага абласнога ўпраўлення адукацыі У.А.Гаўрон і Т.Р.Прадзед, а таксама кіруючыя работнікі раённых аддзелаў адукацыі, адміністрацыі мясцовых школаў і супрацоўнікі ўстаноў культуры.

За час практыкі быў выкананы істотны аб'ём работы. Удалося сабраць творы розных жанраў вуснай народнай творчасці: легенды, паданні, казкі, песні, анекдоты і жарты, замовы, прымаўкі, загадкі, а таксама абрады, звычаі, гаданні, перасцярогі і інш. Вялікую дапамогу ў гэтым аказала тая аўдыётэхніка (магнітафоны), якая была ў студэнтаў, бо гэта дазволіла запісаць не толькі тэксты тых жа песень, але і мелодыі, акрамя таго, спрасціла працу студэнтам, дала магчымасць выканаць больш аб'ём працы. Копіі сабраных матэрыялаў будуць перададзены ў Саюз фальклarystaў Беларусі для навукова-даследчай лабараторыі, і творы будуць пададзены ў кнізе «Фальклор у сучасных запісах. Гродзенская вобласць», праца над выданнем якой пачынаецца ў 1999 годзе.

У в. Тарнова Лідскага раёна студэнтамі і выкладчыкамі было наладжана свята Купалле, якое некалькі гадоў у той мясцовасці не праводзілася. Былі атрыманы вельмі станоўчыя водгукі мясцовага насельніцтва, прадстаўнікоў улады і супрацоўнікаў культуры аб узроўні правядзення свята.

У час практыкі студэнты ўзбагацілі і свой уласны духоўны вопыт, «ужывую» пазнаёміліся з выканаўцамі аўтэнтычных фальклорных твораў, набылі навыкі весці размову з людзьмі розных сацыяльных групаў і ўзросту, асвоілі прыёмы і метады збору твораў вуснай народнай творчасці.

Прайсці сцежкамі продкаў, паслухаць песні ў вясковай хаце, акунуцца ў народную стыхію - гэта значыць ніколі не застацца абыякавым да беларускага слова, песні, свята, да працы селяніна на зямлі.

Практыка прайшла паспяхова, і далейшае яе правядзенне дазволіць выконваць не толькі навучальныя і выхаваўчыя задачы, прывіваць любоў да роднага слова, звычаяў, абрадаў, але таксама дапаможа зрабіць канкрэтныя крокі ў захаванні духоўнай спадчыны беларускага народа для наступных пакаленняў грамадзянаў нашай краіны.

## ЗДАРЭННЕ

Неяк раз ехаў адзін ксёндз са сваім клерыкам ад хворага. Вёска была дальняя і застала іх ноч у дарозе. Сталася так, што шлях іх праходзіў праз могілкі. Вось едуць яны сабе і ў вус не дуюць, гавораць, смяюцца. Раптам у клерыка ажно дух перaняло, бачыць, бягуць за іхнім вазком прывіды, бялюткія такія, ажно свецяцца. Клерыку трохі адлягло ад сэрца - ён штурхае ксяндза і паказвае яму пальцам на тых прывідаў. Паўглядаўся ксёндз на тых істот, а потым як прыпусцілі яны каня шпарчэй. І прывіды таксама хуткасці падбавілі. Хацеў клерык пахрысціць іх, каб адсталі, ды ксёндз не даў. Дастаў ён з кішэні хустачку, махнуў ёю ў той, у другі бок, што ад сябе, - прывіды і пабеглі туды. А ксёндз з клерыкам хутчэй ад таго месца, ад граху далей.

## АБ ПАХОДЖАННІ НАЗВЫ ГОРАДА ЛІДЫ

Прыйшоў князь на тую зямлю, дзе цяпер Ліда стаіць. Стаў там прыгожы горад будаваць. У самым цэнтры пабудаваў вялікі замак прыгожы. Стаў князь думаць, як яму свой горад назваць. Вось і вырашыў назваць ён горад так у гонар сваёй дачкі - Ліды.

**Запісалі студэнткі**
**Н. ГРЫШКЕВІЧ,**
**Т.КРАСЬКО, М.ЦІХОВІЧ,**
**Т. КАНДЫБА, Н. БОРЫС**
**у в. Тарнова**
**Лідскага раёна.**

## ФРАНЦІШАК І МІХАЛІНА

Міхаліна служыла ў панскім маёнтку, была вельмі прыгожай і стараннай дзяўчынай. Ужо колькі год прайшло, як памерлі яе бацькі, і засталася яна сіратой. Францішак, малады паніч, усім сэрцам пакахаў бедную сірату. Ён быў прыгожы і вельмі багаты. Міхаліна таксама закахалася ў паніча.

Аднойчы паніч сказаў сваім бацькам, што хоча ажаніцца з Міхалінай, а бацькі адказалі: «Калі ты жэнішся на ёй, то мы адбярэм у цябе ўсё, што ты маеш». А ён сказаў: «Забірайце ўсё, але я ўсё роўна ажанюся з Міхалінай».

... Калі ад'язджалі да шлюбу, трэба было атрымаць благаславенне бацькоў. Міхаліна з Францішкам тры гадзіны прастаялі на каленях перад яго бацькамі. Калі яны выехалі да вянцу, то перад імі круціўся венік, хоць ветру і не было. З гэтай прычыны жыццё іх пайшло ўкрыў і ўкось.

Францішка прызначылі леснікам. Зажылі добра, усё ў іх было, і дзеткі раслі, як на дрaжжах, але Францішак часта стаў біць Міхаліну. Аднойчы яна забрала дзяцей і ўцякла з імі да сваіх родных. Праз тры дні Францішак прыехаў за імі, але Міхаліна адмовілася ехаць з ім дахаты. Тады Францішак пайшоў за парадай да мясцовага ксяндза. Той параіў яму быць добрым мужам для сваёй жонкі, кахаць яе, шанаваць і не біць.

У той год быў вялікі неўраджай. Насення не хапала нават на тое, каб пасадзіць хлеб на будучы год. Аднойчы прыйшоў Францішак дахаты з працы, а Міхаліна яму кажа, што ў іх госць вялікі. Прыехала яго маці і сядзіць на печы. Яна сядзела там некалькі дзён і плакала. Міхаліна ў яе пытае: «Мама, чаго Вы гэдак плачаце?» А маці Францішка кажа: «Нічога, Міхалінка... Ідзі, ідзі сабе».

... Раней так шанавалі бацькоў: хоць і не прынялі Міхаліну ў сям'ю паніча, але ж яна не адвярнулася ад чужога гора і прыняла ў сваю сям'ю маці Францішка.

## БЕЛАГРУДСКІ ПАН

Жыў некалі ў Белагрудах пан, і было ў яго дзве дачкі і сын. Пайшлі аднойчы дочкі купацца. У час купання сына хваля падагнала да іх абраз, на ім быў намаляваны святы. Прынеслі дочкі яго ў маёнтак і аддалі бацьку. Так як бацька іх быў атэістам, то закінуў ён гэты абраз у самы цёмны кут.

У хуткім часе ў хату прыйшло вялікае гора. Усе яго дзеці аслеплі. Праз некаторы час пану прысніўся сон, у сне голас кажа: «Як ты мяне закінуў у цёмнае месца, так і твае дочкі будуць жыць у цямносці».

Раніцой пан дастаў абраз і павесіў яго ў самае светлае месца ў хаце. Стаў хадзіць у царкву, маліцца, каб Бог дараваў яму яго грахі. Прайшло колькі часу, і яго дзеці зноў сталі відучымі.

**Запісалі студэнты**
**Н. ФІЛІПЧЫК, Н. НОВІК,**
**В. СТРАШЫНСКАЯ**
**ў в. Белагруда**
**Лідскага р-на.**

## КАЗКА

Былі ў бацькі тры сыны: два разумныя, адзін дурны. Чужыя коні надта ў іх авёс убіваліся. Бацька сказаў, каб сыны ішлі старажаваць авёс. Спачатку гэта ён даручыў старэйшаму сыну. Даў яму хлеба, кіўбасу, гарэлкі. Але той не ўпільнаваў: наеўся і заснуў. Накрычаў на яго бацька. На другі дзень пайшоў пільнаваць сярэдні, разумны, сын. Бацька таксама даў яму хлеба, кіўбасы, гарэлкі, але і той, наеўшыся, напіўшыся, заснуў. Бацька і на яго накрычаў. Тады малодшы дурны сын кажа:

- Тата, я пайду пільнаваць.

На што бацька адказвае:

- Старэйшыя разумныя не ўпільнавалі, а ты ўпільнуеш?

Але сын угаварыў яго. Бацька даў яму замест хлеба - сухар, цэглу, каб сумка была цяжэйшая, і ваду. Малодшы сын не заснуў, убачыў прыгожага каня і кажа:

- Сіўка-грыўка, стань перада мною, як ліст перад травою.

Конь стаў. Сын злавіў яго, прывязаў. Хацеў паесці, але ў сумцы была толькі вада і сухар. Ён заплакаў ды і пайшоў дадому. Бацька пахваліў яго.

У гэты час жыў цар, у якога была прыгожая дачка, якая жыла на вялікай гары, і хто да яе даляціць, за таго і пойдзе яна замуж. Тады трэці сын адправіўся да царэўны на кані і даляцеў да яе. Яна была вымушана пайсці за яго. Абвянчаўшыся, пад сталом хлопец стаў косці з сабакамі есці, а не есці разам з усімі. Царэўна плача і кажа бацьку:

- Каго ж ты мне знайшоў?

А цар жа думаў, што ўжо як даляціць, то будзе самы лепшы.

**Запісалі Н.ЛУКАШЭВІЧ,**
**С. ТУПТА, Л. ПІЛЕЦ,**
**Т. САКОВІЧ,**
**І. ГЕРАСІМЕНКА**
**ў в. Урцілені**
**Іўеўскага р-на.**

## ПРЫМАЎКІ

Хто ў жніўні гуляе, той ўзімку галадае.

Кожная хата ў жніўні багата.

Што ў полі ўродзіць, жнівень знаходзіць.

Не хвалі каня запрагаючы, а дзеўку - выбіраючы.

Без гаспадара гумно плача, а без гаспадыні - хата.

Халодны верасень, але сыты.

Як настаў верасень, дык туман кожны дзень.

Каменя - хоць забіся, вады - хоць утапіся, дроў - хоць спаліся, хлеба прыкупіў - можна жыць.

## АНЕКДОТЫ

Гаспадыня:

- Трынаццаць асобаў за сталом! Дай жа, Божа, каб усё было добра.

Госць:

- Не бойцеся, пані. Я буду есці і за сябе, і за чатырнаццатую асобу!

* * *

Суддзя:

- Чаму Вы, грамадзянін, дзвюма бутэлькамі пусцілі ў свайго суседа?

Абвінавачаны:

- Бо першай не патрапіў, пане.

**Запісалі Н. ШЫШ,**
**І. НЕСЦЕР, В. ШОСТКА**
**ў в. Морына**
**Іўеўскага р-на.**

## ХРЭСЬБІННАЯ ПЕСНЯ

Кума, кума, кумушка,
Дзе жывеш?
Чаму мяне ў госцейкі
не завеш?
Ці ты, кума,
розуму не маеш?
Ці ты мае хатанькі
не знаеш?
Гэта мая хатанька ля вады,
Бы дзераўца лебяды.
Тады цябе ў госцейкі пазаву,
Як свежанькай рыбанькі
палаўлю.
Тая свежа рыбанька -
акунёк,
Дарагія госцейкі -
мой кумок.

**Запісалі студэнткі**
**Т. ВАЛАТКОВІЧ**
**І А. КАРАНЕЦ**
**ў в. Ярчакі**
**Мастоўскага р-на.**

## ПРЫПЕЎКІ

Села баба на курыцу,
Выехала на вуліцу.
Усе хлопцы не пазналі
І «Дзень добры» ёй сказалі.
Там на гарэ
Мужык жонкаю гарэ,
А другая падбягае:
«Запражыце і мяне».
А ў Валодзі ў агародзе
Расцвітае белы мак.
Усе хлопцы пажаніліся,
А Валодзя ходзіць так.

**Запісалі студэнткі**
**В. БУЧЫНСКАЯ,**
**Н. САЛЕЙ,**
**І. НОВІКАВА,**
**В. ДЗЯМІДА**
**ў в. Заберазь**
**Іўеўскага раёна.**

## ЗАГАДКІ

Маці з локаць, бацька з сажань, а дзеці з палец. *(Граблі).*

З хаты ў хату водзіць, а сама не заходзіць. *(Дарога).*

Цяпло прыйдзе - апранецца, холад настане - распранецца. *(Дрэва).*

Повен падпечак залатых яечак. *(Жар у печы).*

Было жоўтым, вырасла зялёным, сонца пацалавала, зноў жоўтым стала. *(Збожжа).*

У зямлю крычыць, а голас да неба ляціць. *(Звон).*

Стары згорблены дзядок мае доўгі насок, ткне перад сабой лясок і складае ў снапок. *(Серп).*

**Запісала студэнтка**
**В. САТЫЧ**
**у в. Галубы**
**Мастоўскага раёна.**

Расцілі, збіралі, таптали, ткалі і на стол засцілалі. *(Абрус).*

Пакуль бацька народзіцца, сын ужо находзіцца. *(Агонь і дым).*

Пяць валоў адну саху цягнуць. *(Аловак у руцэ).*

Маці з дачкою, маці з дачкою, а ўсіх - толькі трое. *(Бабуля, дачка, унучка).*

На слупах бялёных шапкі зялёныя. *(Бяроза).*

**Запісала студэнтка**
**А. ЛАПАТКА**
**ў в. Галубы**
**Мастоўскага р-на.**

Не птушка, а за мора лятае. *(Пісьмо).*

Белая кабыла ўвесь лес з'ела. *(Печка).*

Каля носа ўецца, у рукі не даецца. *(Пах).*

Прыйшоў госць і пад лаву шусць. *(Ногі).*

Хата з вокан, а не ўцячэш. *(Нерат).*

**Запісала**
**Ж. КОТАВА**
**ў в. Галубы**
**Мастоўскага р-на.**

* * *

А ў садочку ў куточку
Куст малінавы завяў,
А са мной сядзіць
смаркаты,
Толькі местачка заняў.
Мяне мама нарадзіла,
Думала харошая.
Адвярнула, паглядзела -
Рыжая, курносая.
Мілы курыць папяросу,
Дым пускае на мяне,
Сам таварышу маргае,
Ухажорачка мая.

**Запісалі студэнткі**
**Н. ГРЫШКЕВІЧ,**
**Т. КРАСЬКО,**
**М. ЦІХОВІЧ,**
**Г. КАНДЫБА**
**ў в. Тарнова**
**Лідскага раёна.**

## КАЛЫХАНКА

А-а-а- , дзіця, спаць,
Два анёлы калыхаць:
Адзін - удзень, другі -
уночы,
А сам Пан Бог
да памоцы.
А-а-а, люлі, люлі,
Коціка лаю,
Каб ён да нас не хадзіў,
Дзетак нашых не будзіў.
А-а-а, а ты, коце,
Коце ты маркоце.
Не хадзі, ты, коце,
Наша Іра спаці хоча.
А-а-а, люлі, люлі,
А-а-а, люлечкі.

**Запісалі студэнткі**
**Н. ГРЫШКЕВІЧ,**
**Т. КРАСЬКО,**
**М. ЦІХОВІЧ, Г. КАНДЫБА**
**ў в. Тарнова**
**Лідскага раёна.**

* * *

Ой, тонка сасонка
У лесе зашумела,
Маладая дзяўчына *2 р.*
Замуж захацела.
Бадай ты, дзяўчына,
Без хлеба сядзела,
Што так маладая *2 р.*
Замуж захацела.
Ты ў мамы дачушка,
Як у гаю птушка:
Куды захацела, *2 р.*
Туды паляцела.
Прыбрана, як лялька,
А ў руцэ - скварка,
У місе - смятана, *2 р.*
Дачушка кахана.
Трэба стаць, падумаць,
Каб не ашукацца.
Будзе табе горай, *2 р.*
Як у роднай хаце.
Будзеш ты не еўшы,
Будзеш ты не спаўшы,
Будзеш ты галодна, *2 р.*
Будзе твар заспаны.
Успомні сваю хатку,
Айца й родну матку.
Слязьмі абальешся. *2 р.*
Назад не вернешся.
Там трэба рана ўстаць,
Дзіцяці цыцку даць,
А потым падумаць, *2 р.*
Дзе крапівы сабраць.

**Запісалі студэнткі**
**Н. ГЕЛЕЖА, Н. ДЗІВІНА,**
**Т. ШАВЕЛЬ, А. ШУБЗДА**
**ў в. Урцішкі**
**Іўеўскага раёна.**

* * *

А на Яна, Яна Купала,
Дзеўка землю капала.
Дзеўка землю капала
Ды ў бацюшкі пытала:
- Ты мой бацюшка
родны,
Што ж гэта за зелле?
- Белае карэнне
і чорнае насенне -
То тваё пляменне,
Жоўтае цвіценне -
То тваё вяселле.

**Запісалі студэнткі**
**Н. ГЕЛЕЖА, Н. ДЗІВІНА,**
**Т. ШАВЕЛЬ, А. ШУБЗДА**
**ў в. Забярэзь**
**Іўеўскага раёна.**

ОБСУЖДАЕМ ПРОЕКТ РЕФОРМЫ ВЫСШЕЙ ШКОЛЫ

# ГУМАНИТАРИЗАЦИЯ - ПАНАЦЕЯ ДЛЯ ВЫСШЕГО ОБРАЗОВАНИЯ?

**Ю. ЗОЛОТУХИН,**
**заведующий кафедрой алгебры, геометрии и методики преподавания математики, кандидат физико-математических наук, доцент**

В последние годы в дискуссиях о путях развития белорусской высшей школы центральное место занимает проблема гуманизации. Характерна позиция авторов первой проектной версии концепции высшего образования в Республике Беларусь, провозгласивших гуманизацию системы образования «одновременно и целью, и принципом обучения и воспитания в современном обществе». Данный проект, подготовленный Учебно-методическим центром «Высшая школа» РИВШ БГУ, поступил для обсуждения в вузы страны в июне 1998 года.

Трудно было не согласиться с этим тезисом, если бы гуманизация не была бы столь возвышена над другими образовательными ценностями и не преподносилась бы при этом как образовательно-педагогическая задача, основным способом решения которой является гуманитаризация процесса обучения.

Безмерно преувеличивая значение гуманизации образования, авторы проекта допускают, на наш взгляд, серьезную методологическую ошибку. Попытка присвоения безусловного приоритета одному из элементов триады «личность-общество-природа» представляется несостоятельной как с научной, так и с практической точек зрения. И в теории, и в жизни они существуют не сами по себе, а находятся в неразрывной диалектической связи.

Предполагая «центральную роль личности учащегося, студента в учебном процессе», они незаслуженно игнорируют роль других субъектов образования (преподавателей, родителей, общественных организаций, государственных институтов и т.д.). Не случайно в данном проекте, как и в других публикациях, фетишизирующих принцип гуманизации, почти не упоминаются порядочность, нравственность, трудолюбие, ответственность, дисциплина и самодисциплина, законопослушание, патриотизм, экологическая культура и т.п.

Упор на взращивание самодостаточного гармонически развитого интеллектуала-всезнайки, по нашему убеждению, не может быть сверхзадачей современного образовательного процесса. Даже самое разностороннее образование не является гарантом духовного роста его субъектов, не обеспечивает их социальную эффективность, интеллигентность. Более того, не так уж редки случаи, когда блестящее гуманитарное образование используется во вред обществу и государству.

Поэтому необходимо воспитывать и глубокие гражданские качества, позволяющие реализовать личностный интеллектуальный потенциал в общественной практике и использовать его на благо социального прогресса. К сожалению, вопросы воспитания студентов в духе сознательной и действенной социальной ответственности не нашли достойного отражения в проекте концепции.

Государство же, как надстроечная структура, также не может играть главенствующую роль в образовательном процессе, но оно и не должно быть оставлено в стороне от него. Закономерный отказ от тоталитарной схемы организации системы образования ни коим образом не предопределяет выбор ее радикально-либерального варианта. Последний не имеет корней в белорусском социуме, не отвечает особенностям его менталитета и поэтому не сможет обеспечить эффективного продвижения вперед.

Необоснованная акцентировка личностного подхода закономерно привела к другому методологическому просчету. Парадоксально, но факт: в сложной экономической ситуации, когда надежды на выздоровление общества связываются прежде всего с восстановлением и укреплением его материальной базы, в проекте концепции не уделяется должного внимания профессиональной компоненте образования.

Более того, закрепление за гуманитаризацией привилегии быть главным средством претворения в жизнь принципа гуманизации образования на практике неминуемо приводит к существенному понижению уровня и качества профессиональной подготовки. Между тем, как показывает опыт, молодые люди поступают в вузы прежде всего с целью получения специальности, справедливо полагая, что именно она поможет им успешно укрепиться в жизни. Если действовать последовательно демократически, следовало бы выяснить их мнение о целесообразности проведения политики тотальной гуманитаризации или хотя бы предупредить при поступлении, что подготовка к профессии отнюдь не является главным направлением учебного процесса в реформированном учебном заведении.

Следует иметь ввиду, что безбрежная гуманитаризация высшего образования имеет объективное препятствие - небывалое расширение и углубление массива общих, специальных и технологических знаний, накопленных в профессиональных областях, овладение которыми является необходимым условием воспитания современного специалиста. Проблема их отражения в планах профессиональной подготовки сама по себе приобретает первостепенное значение и становится все более трудноразрешимой. В тех же случаях, когда обучение в вузе ведется по сдвоенной специальности, она трудноразрешима вдвойне.

Другими словами, альтернатива «специалист высокой квалификации -гармонически развитая личность» почти фатально навязывается образованию самим ходом развития общественного производства. Конечно, педагогическая наука должна найти пути ее разрешения, но сомнительно, что к таковым можно отнести гуманизацию образования в духе сплошной гуманитаризации.

В данном контексте представляется научно необоснованным выдвижение в проекте в качестве одного из принципов гуманизации высшего образования категорического требования об определении «порогового уровня удельного веса гуманитарных дисциплин в общем объеме изучаемых предметов» (?) в 25-30% для негуманитарных учебных заведений, а также предложения об «усилении внимания к расширению номенклатуры учебных дисциплин гуманитарного цикла» (см. раздел 6). Здесь нам трудно удержаться, чтобы не привести здравое предостережение, высказанное В.И. Дыничем в статье, опубликованной в журнале «Вышэйшая школа» (1997, №6): «Чрезмерное увлечение гуманитарной составляющей образования может привести к тому, что наши потомки, образно говоря, будут ощущать себя в предметном мире, как белорусский крестьянин начала века в городской среде».

Внедрение в практику высшего образования принципа «каждой сестре по серьге», в соответствии с которым в учебный процесс вузов вводится много абстрактных, оторванных от нужд приобретаемой профессии, новосформированных гуманитарных дисциплин, как правило, плохо обеспеченных литературой, эффективными методиками и квалифицированными преподавателями, бесперспективно. И не только потому, что этот процесс ослабляет базу фундаментальной, специальной и практической подготовки к профессии. Дело еще и в том, что вербально-аудиторный метод гуманизации крайне непродуктивен.

Не вызывает сомнения, что для гармонизации личности студента-негуманитария наибольшее значение имеет не теоретический, а прикладной аспект гуманизации. В этом плане более плодотворное ее направление связано, очевидно, с созданием благоприятного морально-психологического климата в группе и вузе, введением человеческого измерения в преподавание и воспитание, всесторонним приобщением студентов к лучшим образцам национальной и мировой культуры, привлечением их к чтению гуманистической литературы (как художественной, так и специальной - по философии, психологии, праву, валеологии и т.д.), содействием просмотру хороших кинофильмов, неформальным экологическим воспитанием, проведением бесед и дискуссий на морально-этические темы и т.п.

Не менее перспективным направлением гуманизации высшего образования, безусловно, является усиление гуманитарной составляющей подготовки к работе по специальности. Логически обусловленное, уравновешенное внедрение в ее ядро гуманитарных знаний трудно переоценить. Это можно было бы сделать по крайней мере двумя способами: с одной стороны - через разработку и включение в учебный процесс вузов полновесных курсов по истории, философии, методологии соответствующих предметных областей (математики, медицины, техники и т.д.) с другой стороны - через актуализацию гуманитарного потенциала дисциплин, обслуживающих профессиональную подготовку.

Оба указанных подхода полностью отвечают принципу личностно-профессиональной направленности обучения, получающему все большее признание в преподавательской среде. Однако в настоящее время они используются крайне слабо, прежде всего ввиду сложности организационных и методических задач, возникающих при попытке их внедрения в практику преподавания. Решению последних в большой степени содействовала бы переориентация части исследований по общей эдукалогии на решение конкретных проблем профессионального образования. Важную роль при этом могло бы сыграть тесное сотрудничество теоретиков философии образования, педагогики и психологии с преподавателями естественно-научных и технологических дисциплин.

Что касается «аудиторного» направления гуманизации, то, по нашему мнению, гуманитарный компонент профессионального образования было бы целесообразно оформить в виде небольшого числа интегрированных курсов, построенных на модульной основе, исключающей их взаимное дублирование. Такие курсы должны составлять непрерывную учебную линию, не растянутую по времени и отражающую возможности организации гуманитарной подготовки в рамках образовательно-профессиональной программы данной специальности. Безусловно, они должны иметь прикладную и профессиональную направленность.

Подчеркнем, что последнее, исключительно важное, условие нелегко выполнить, поскольку нынешний этап развития философии, педагогики и психологии высшей школы закономерно (в силу относительной непродолжительности их эволюции) отличается повышенной степенью общности и недостаточно высоким уровнем взаимодействия с ее негуманитарными ареалами. В преподавании это достаточно часто проявляется в несоответствии гуманитарных дисциплин интересам будущей специальности слушателей, что снижает мотивацию учения, нанося вред личностному и профессиональному формированию студентов.

Поэтому необходимо провести целенаправленную работу по «привязке» указанных дисциплин к

*(Продолжение на 8-й стр.)*

# Студенческий меридиан

## Девять месяцев до... или финиш уже близок



**Четырехлетний стаж студенческой жизни уже за плечами, а как много еще хочется сделать и узнать! Всего через несколько месяцев на смену многочисленным лекциям, увлекательным семинарам и познавательным лабораторным придут не менее интересные школьные уроки. Пятилетний труд в университете делает из рядового школьника настоящего учителя. И пусть опыта еще маловато, но энтузиазма и энергии не занимать. Как известно, будущий учитель физики должен уметь все: отремонтировать прибор, собрать физическую установку, решить экспериментальную задачу и при этом выглядеть на все сто. Последнее девушкам физтеха удается лучше всего.**

**На снимке: слева направо - студентки пятого курса физико-технического факультета Наталья КИРИЛОВА, Галина ДАЙНЕКО, Елена ХОЛОДКОВА, Елена КУЛЕВСКАЯ.**

**Фото Е. ХОЛОДКОВОЙ.**

## ДА СПАДЧЫНЫ РОДНАГА КРАЮ

**Вольга КАРНЕВІЧ,**
**студэнтка II курса філалагічнага факультэта**

Пры сярэдняй школе N 24 г. Гродна пад кіраўніцтвам выкладчыка Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта М.А. Мельнікава дзейнічае літаратурна-краязнаўчы клуб імя М. Багдановіча. Клуб яшчэ зусім малады, але ён аб'яднаў тых хлопчыкаў і дзяўчынак, якія імкнуцца больш даведацца пра сучаснае і мінулае свайго роднага краю.

*Равуць вятры,*
*грымяць грамы,*
*Пыл засціць вочы нам,*
*І ўсё ж,*
*І ўсё ж мы дойдзем,*
*Дойдзем мы*
*Да Беларусі!*

Гэтыя радкі Ніла Гілевіча сталі дэвізам літаратурна-краязнаўчага гуртка.

Першым крокам стала наведванне вёскі Гудзевічы, што ў Мастоўскім раёне, і яе знакамітага музея. Краязнаўцы пазнаёміліся са стваральнікам музея Алесем Мікалаевічам Белакозам. Шмат прыемных уражанняў пакінуў аб сабе гэты незвычайны чалавек. «Як жыць, дык жыць для Беларусі», - такія словы пачулі ад Алеся Мікалаевіча, словы, з якімі ён ідзе па жыцці, дапамагаючы малодшаму пакаленню знайсці свой шлях.

Наступны крок - знаёмства з выкладчыкам Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы Аляксандрам Уладзіміравічам Мілінкевічам, які пазнаёміў юных краязнаўцаў з гісторыяй роднага горада. Больш за 870 гадоў стаіць над Нёманам старажытны Гродна. Шмат бачыў ён на сваім быцці - і войны, і пажары, і барацьбу за сваю незалежнасць. У канцы сустрэчы нейк самі сабой прыгадаліся радкі верша М. Васілька, якія былі запісаны ў летапіс:

*Добры дзень,*
*мой горад родны,*
*Мой з маленства*
*назаўжды...*
*Старажытны*
*горад Гродна,*
*Сёння - новы, малады.*

Сябры гуртка ўпэўнены: каб любіць Беларусь, спачатку трэба навучыцца шанаваць той куточак, дзе ты нарадзіўся.

На працягу навучальнага года гурткоўцы рыхтаваліся да паходаў і экспедыцый, распрацоўвалі маршруты, складалі літаратурна-краязнаўчую карту раёна.

А на летніх канікулах паехалі на экскурсію ў Навагрудак, назіралі за рэстаўрацыйнымі работамі, наведалі музей Адама Міцкевіча.

Пасля невялікага летняга перапынку юныя краязнаўцы аднавілі сваю дзейнасць. Наведалі выставу беларускай кнігі ў бібліятэцы імя Карскага. Выстава была прысвечана дню беларускага пісьменства.

Сумесна з музеем Максіма Багдановіча краязнаўцы адзначалі «Памінальны дзень», прысвечаны 100-годдзю з дня смерці маці паэта - Марыі Апанасаўны Багдановіч-Мякоты. Прынялі ўдзел у вечарах тэатра лялек.

Прадстаўнікі літаратурна-краязнаўчага клуба прысутнічалі на сустрэчы з удзельнікамі міжнароднага семінара «Што нас спалучае, што нас аб'ядноўвае», які арганізавала Нацыянальная рада юнацкіх і дзіцячых арганізацый Беларусі пры дапамозе нідэрландскага савета юнацкіх арганізацый «31».

З цягам часу хацелася ведаць усё больш і больш. Таму краязнаўцы пачалі наведваць разнастайныя мастацкія і фотавыставы, праводзілі цікавыя сустрэчы з Апанасам Цыхуном, на якіх абмяркоўвалася яго кніга «Легенды і паданні Гродзеншчыны». «Зямлі сваёй не пакідай», - такі наказ даў А. Цыхун, чалавек, які праз цяжкія выпрабаванні змог пранесці ў сваім сэрцы самае дарагое - сваю Радзіму, Беларусь і тую вёсачку, дзе нарадзіўся.

Данута Іванаўна Бічэль-Загнетава таксама была госцем клуба. Паэтэса падаравала юным краязнаўцам свае новыя вершы.

За плячыма ўдзельнікаў клуба - два гады нястомнай працы. Юнакі і дзяўчаты цяпер ужо студэнты, але літаратурна-краязнаўчы клуб па-ранейшаму дзейнічае. Цяпер яго ўдзельнікамі сталі васьмікласнікі, якія працягваюць пачатую працу.

## ПРАКТЫКА БЫЛА КАРЫСНАЙ

Наша група - Ала Жук, Юрый Каменскі, Сяргей Роўба, Сяргей Рудагін, Юрый Чарняк - другі год праходзілі практыку ў СШ N 25. За гэты час мы навучаліся высновам мастацкага рамяства. Мы праводзілі ўрокі па прадметах: Гісторыя, Чалавек і Грамадства, Сусветная мастацкая культура, а таксама праводзілі ўрокі Міру, экскурсіі, дапамагалі класным кіраўнікам.

Трэба адзначыць, што не ўсе атрымлівалася, як трэба. Калі-нікалі не хапала часу, не наладжваўся кантакт з некаторымі вучнямі (асабліва ў 11-х класах), але ў цэлым практыка прайшла цікава і няцяжка. У гэтым нам дапамагалі нашы кіраўнікі практыкі: Міхаіл Вікенцьевіч Васілючак, Мікалай Нікіфаравіч Бяспамятных і школьныя настаўнікі: Людміла Васільеўна Дзятчык, Наталля Мікалаеўна Каталікава, Аксана Іванаўна Казак. Яны забяспечвалі нас неабходнымі матэрыяламі, парадамі, знаёмілі з нюансамі педагогікі. Наш псіхолаг Лілія Мар'янаўна Пуцята дапамагала практычнымі парадамі па наладжванню кантактаў з вучнямі. Мы вельмі ўдзячны ім, а таксама дырэкцыі школы, за дапамогу ў правядзенні практыкі.

Цікавымі былі адносіны вучняў да нас, студэнтаў-практыкантаў. Мы іх прываблівалі, як і ўсё новае. Гэтаму сведчыць добрая дысцыпліна на ўроках. Як нам па сакрэту сказалі вучні, дысцыпліна нават палепшылася. Мы ганарымся гэтым.

Такім чынам можна адзначыць, што наша практыка была паспяховай. Мы атрымалі неабходныя веды для далейшай працы ў якасці настаўнікаў.

**С. РУДАГІН,**
**студэнт факультэта гісторыі і культуры**

## ГУМАНИТАРИЗАЦИЯ - ПАНАЦЕЯ ДЛЯ ВЫСШЕГО ОБРАЗОВАНИЯ?

*(Начало на 6-й стр.)*

программам профильной подготовки и созданию их модификаций для различных ее направлений. Неразработанность частных философий, педагогик и психологий является одной из главных причин негативного отношения технократической интеллигенции и студентов, готовящихся пополнить ее ряды, к общему образованию. В связи с этим их научное и методическое оформление представляется актуальной задачей.

Завершая рассуждения о соотношении между гуманитарным и профессиональным в высшем образовании, позволим еще высказать предположение, что упор на его гуманитарную компоненту может позволить государство с эффективной и устоявшейся социально-экономической системой, имеющее возможность привлекать квалифицированные научно-технические кадры извне. Для общества же, пытающегося выбраться из тисков экономического кризиса, он является губительным.

Тем не менее, по свидетельству компаративистов, существует немало и богатых стран, в которых очень высоко оценивается роль подготовки к работе по специальности. Так, в рамочном законе о высшей школе ФРГ 1976 года цель вузовского обучения формулировалась следующим образом: «Преподавание и учение должны готовить студента к профессиональной деятельности и сообщать ему необходимые для этого знания, умения и методы в соответствии с курсом обучения...» Исследователи указывают, что тенденция усиления практической направленности университетского образования является одной из доминирующих во многих развитых странах.

Остается еще повторить замечание из приведенных в Приложении 2 к данной концепции рекомендаций Организации экономического сотрудничества и развития правительству Польши по итогам анализа ее системы высшего образования: «... предлагается перенести акцент на достижение умений и профессиональной компетентности с учетом требований заинтересованных сторон, в первую очередь работодателей».

В полной мере этот совет можно отнести и авторам данного проекта.

## СЕМІНАР ПРАЦЯГВАЕ РАБОТУ

**С.В. ЛЫТНЕЎ,**
**метадыст навучальна-метадычнага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы**

Паспяхова пачаў сваю работу ў 1998/99 навучальным годзе на матэматычным факультэце навукова-метадычны семінар «Матэматычная адукацыя». Кіраўнікі - прафесар І.П. Мартынаў, прафесар А.А. Пякарскі, дацэнт Ю.П. Залатухін.

На першым пасяджэнні, якое адбылося 9 верасня, з дакладам «Метадалогія адукацыі. Праблемы і перспектывы» выступіў А.С. Анісімаў, доктар псіхалагічных навук, акадэмік МААН, прафесар кафедры акмеалогіі і псіхалогіі прафесійнай дзейнасці Расійскай акадэміі дзяржаўнай службы пры Прэзідэнце РФ. (г. Масква).

30 верасня з дакладам «Аб выкладанні фундаментальных матэматычных дысцыплін ва універсітэце» выступіў Я.П. Далжэнка, доктар фіз.-мат. навук, акадэмік МАН ВШ, прафесар кафедры тэорыі функцый МДзУ імя М.В. Ламаносава.

У мінулым навучальным годзе адбылося 7 пасяджэнняў семінара, на якіх былі заслуханы і абмеркаваны наступныя даклады і паведамленні:

15 кастрычніка 1997 года. А.П. Кузняцова (г. Мінск, БДзПУ). З вопыту выкладання дыдактыкі матэматыкі ў педагагічным універсітэце.

19 лістапада 1997 года. Г.М. Дулуб (г. Гродна, дырэктар СШ N 1). Канцэпцыя развіцця навучальных устаноў новага тыпу ва ўмовах рэфармавання школы і падрыхтоўкі новага закона аб адукацыі.

17 снежня 1997 года. Г.С. Сідарчук, В.А. Горская, Н. Ражко Навуковая і метадычная дзейнасць гісторыка беларускай матэматычнай адукацыі Н.Д. Бяспамятных (1910-1987 гг.).

18 лютага 1998 года. 1. В.І. Бернік (г. Мінск, інстытут матэматыкі АН РБ). Роля і месца матэматычных алімпіяд школьнікаў у працэсе рэфармавання сістэмы адукацыі. 2. Г.А. Мядзведзеў (г. Мінск, БДзУ). Структура і змест падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасці «Актуарная матэматыка».

18 сакавіка 1998 года. М.А. Маталыцкі. Сеткі масавага абслугоўвання ў стацыянарным і пераходным рэжымах (прадстаўленне дысер-тацыі на саісканне ступені доктара фізіка-матэматычных навук).

15 красавіка 1998 года. А.А. Латоцін, Б. Дз. Чабатарэўскі (г. Магілёў, дзяржуніверсітэт). Навучанне матэматыцы ў дасістэматычным курсе.

11 чэрвеня 1998 года.М.К. Патапаў (г. Масква, МДзУ імя М.В. Ламаносава). Аб новым пакаленні расійскіх падручнікаў па матэматыцы.

3 чэрвеня 1998 года адбылася выніковая канферэнцыя семінара «Матэматычная адукацыя». На ёй прагучалі наступныя паведамленні:

І.М. Сцяпура. Навукова-метадычны аналіз праграм, падручнікаў і зборнікаў задач па алгебры для сярэдняй школы ў перыяд з 1945 па 1980 год.

Е.В. Кравец. (г. Магілёў, дзяржуніверсітэт). Выкарыстанне тэстаў у мэтах фарміравання матэматычных паняццяў.

І.А. Якушына. Лакальная аксіяматызацыя ў выкладанні матэматыкі ў сярэдніх школах Польшчы.

Ю.П. Залатухін, Т.В. Бабарыка. Выкарыстанне мадэльных прастор у выкладанні агульнай тапалогіі.

В.А. Горская. Роля і месца курса «Гісторыя і метадалогія матэматыкі» ў падрыхтоўцы настаўнікаў матэматыкі.

У той жа дзень была праведзена дыскусія «Праблемы матэматычнай адукацыі». У ходзе яе С.В. Лытнеў, В.А. Горская, Ю.П. Залатухін прааналізавалі новыя падыходы да правядзення педагагічнай практыкі студэнтаў матэматычнага факультэта і прадставілі праект яе праграмы. А.М. Мятліцкі падзяліўся з прысутнымі меркаваннямі наконт далейшых перспектыў і напрамкаў узаемадзеяння універсітэта з навучальнымі ўстановамі новага тыпу.

Т.В. Сталярова (г. Магілёў, дзяржуніверсітэт) расказала аб пошуках магілёўскіх даследчыкаў новых тэставых форм кантроля і навучання школьнікаў матэматыцы.

Л.У. Кірылюк пазнаёміла калег і пракаменціравала вынікі даследавання «Экзамен вачыма студэнта».

М.У. Касперка (г. Гродна, ІПК КР і СА) звярнула ўвагу на пытанні павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі.

У 1998/99 навучальным годзе семінар працягвае працу. Пасяджэнні праводзяцца кожную трэцюю сераду месяца. Запрашаем настаўнікаў, метадыстаў, выкладчыкаў вышэйшай школы, усіх, хто цікавіцца праблемамі матэматычнай адукацыі, прыняць удзел у яго працы.

Кантактны тэлефон 44-34-87 (кафедра алгебры, геаметрыі і методыкі выкладання матэматыкі).

## СПОРТ

❋ Ва ўрочышчы Пышкі адбыўся легкаатлетычны крос, прысвечаны 20-годдзю ўтварэння Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы.

❋ Прайшоў чэмпіянат Еўропы па грэка-рымскай барацьбе. Наша каманда выйграла Кубак Еўропы.

❋ Праведзены спаборніцтвы па міні-футболу, па дзюдо.

## НАМ ПИШУТ

*Выражаю сердечную благодарность ректорату, профкому, женсовету, Совету ветеранов труда за помощь пожилым людям.*

*С теплотой вспоминаю годы, проведенные в стенах пединститута и университета, часто вспоминаю людей, окружавших меня - живых и ушедших. Я любила свою работу и коллектив.*

*Спасибо Вам за понимание, доброту и участие.*

*Знаю, что это нелегко в наше тяжелое время, но о ветеранах помнят...*

С благодарностью —
**Вера МИТЯСОВА,**
**ветеран труда,**
**г. Гродно.**

## ПАСПЯШАЙЦЕСЯ!

**Да ўвагі ўсіх, хто карыстаецца паслугамі бібліятэкі!**

**На працягу лістапада неабходна прайсці перарэгістрацыю ў бібліятэцы і яе філіялах.**

**Чытачы, якія не прайшлі перарэгістрацыю, абслугоўвацца не будуць.**

**Бібліятэка.**

*Рэдактар* **Людміла Мікалаеўна ДАНІЛАВА**

*Заснавальнік: Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы.*
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 519.

Газета набрана, звярстана і надрукавана на тэхніцы выдавецкага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. ЛП № 111 ад 29.12.97 г.
Вул. Ажэшкі, 22, 230023, г. Гродна.

*Набор і вёрстка:* **М. ВЕРСТАК, П. БАЗЫЛЬЧЫК**
*Карэктура:* **Н. ДУДКО**

*Здадзена ў набор 12.10.98.*
*Падпісана да друку: 29.10.98. 15.00*
*Заказ № 114*
Аб'ём - 1 ум. друк. арк.
Наклад 500 асобнікаў.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

*Наш адрас:* ✉ *230023, г.Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 228.* ☎ *72-08-17.*